# БАЕЦ КУЛЬТУРНАГА ФРОНТУ

Шматлюдна бывае пасля рабочага дня ў памяшканні Баханскай сельскай бібліятэкі. Калгаснікі прыходзяць сюды, каб выбраць цікавую кнігу, пачытаць часопісы і газеты, прыняць удзел у мерапрыемствах, якія арганізоўвае бібліятэкар Вольга Дзянісаўна Радзькова. У гэтым годзе сіламі савета бібліятэкі тут праведзены літаратурна-тэматычныя вечары, прысвечаныя дню нараджэння камсамола, памяці А. М. Горкага, канферэнцыя чытачоў па кнізе З. Васкрасенскай „Сэрца маці“. Вечары зацікавілі ўсіх жыхароў вёскі і ў іх прымалі ўдзел калгаснікі, служачыя, школьнікі. Усё гэта дапамагае ў прапагандзе кнігі.

Вельмі цікава праходзяць у бібліятэцы і ранішнікі. Усяго іх праведзена дзесяць. Вялікую ўвагу В. Д. Радзькова ўдзяляе ў іх рэвалюцыйнай тэматыцы. Аб гэтым сведчаць ранішнікі „Камуністы — заўсёды наперадзе“, „Аб чым марылі яны, аб чым марым мы“, на якіх расказвалася аб жыцці і дзейнасці змагароў за наша шчасце.

Да канца года ў бібліятэцы запланавана правесці яшчэ некалькі вечароў, канферэнцый чытачоў і ранішнікаў. У хуткім часе з камсамольцамі калгаса „Чырвоны маяк“ будзе праведзена канферэнцыя па кнізе Б. Палявога „Доктар Вера“. Зачастую калгаснікі з-за недахопу часу не маюць магчымасці прыйсці ў бібліятэку. Хворым, інвалідам таксама цяжка наведваць яе. Для таго, каб даставіць ім кнігу, Вольга Дзянісаўна арганізавала цімураўскую каманду. У яе ўваходзяць вучні Баханскай сярэдняй школы. Найбольш актыўныя з іх шасцікласнікі Віктар Гераськін, Уладзімір Сёмачкін і Мікалай Сідорын. Яны прыносяць кнігі людзям дадому, а калі яны прачытаюць іх — дастаўляюць новыя.

Бібліятэка добра аформлена нагляднай агітацыяй. У зале ёсць маляўнічыя стэнды: „Наша вёска за гады Савецкай улады“, „Пісьменнікі Беларусі“, „Успомнім тых, хто аддаў сваё жыццё пры абароне нашай Радзімы“.

Для агітатараў і прапагандыстаў адведзен стол даведак. Увагу наведвальніка прыцягваюць вітрына „Кнігі аб перадавым вопыце ў сельскай гаспадарцы“ і куток атэіста.

Кніжны фонд састаўляе 9286 экземпляраў. У асноўным гэта мастацкая, на-
вукова-папулярная, пал
тычная і тэхнічная літара
тура. Кнігі расстаўлены п
раздзелах, акуратна ўтрым
ліваюцца на паліцах. Бі
ліятэку наведваюць 672 ч
тачы. З кожным днём і
лік павялічваецца. Знач
ную дапамогу ў гэты
аказваюць члены бібліятэ
нага савета, камсамольц
вясковая інтэлігенцыя. Су
меснымі сіламі яны право
дзяць літаратурныя веча
ры, дыспуты, афармляюц
кніжныя вітрыны. Усё гэ
та дае добры плён.

Пасля заканчэння культ
асветвучылішча Вольг
Дзянісаўна Радзькова пра
цуе ў бібліятэцы 16 га
доў. Сваёй сціплай праца
яна духоўна ўзбагачае ду
шу чалавека — будаўнік
камунізма.

**Ул. Таранкоў.**

в. Баханы.



**Таранкоў, Ул. Баец культурнага фронту** / Ул. Таранкоў // Шлях Кастрычніка. — 1967.

*Мерапрыемствы ў Баханоўскай сельскай бібліятэцы.*